*А.А. Варанько*

БДЭУ (Мінск)

## ПЫТАННІ СПЫНЕННЯ ШЛЮБУ Ў КАНАНІЧНЫМ І СВЕЦКІМ ПРАВЕ Ў БЕЛАРУСІ ЭПОХІ АДРАДЖЭННЯ

Найбольшую цікавасць для Беларусі выклікае эпоха Адраджэння. Менавіта тады склалася знакамітая сістэма права нашай дзяржавы, якая дзейнічала амаль да сярэдзіны XIX ст. Асноўная мэта маёй працы — разглядзець на аснове аналізу статутнага заканадаўства найбольш цікавы інстытут шлюбна-сямейнага права — спыненне шлюбу. Метадамі, якімі я карыстаўся пры выкананні гэтай працы з'яўляюцца: гісторыка-прававы, параўнальна-прававы, індукцыя, аналіз, сінтэз, дэдукцыя, фармальна-лагічны і інш.

Спыненне шлюбу рэгулявалася як кананічным, так і свецкім правам. Што датычыцца асобных прычын па свецкаму праву, то гэта была ўзаемная згода бакоў (шляхта і мяшчане); існаванне іншага шлюбу ў мужа ці жонкі.

Былі і агульныя прычыны па царкоўнаму і свецкаму праву: смерць аднаго з бакоў; існаванне ступені роднасці паміж мужам і жонкай; за ўчыненне цяжкага дзяржаўнага злачынства адным з бакоў і аб'ява гэтай асобы выгнанай з дзяржавы; няздольнасць мужа да шлюбнага жыцця (але па асабістым сэнсе).

Што датычыцца асобных прычын спынення шлюбу па царкоўнаму праву, то гэта: уступленне аднаго ці абодвух бакоў у манастыр; рознае веравызнанне жонкі і мужа; пералюб (мужа ці жонкі). Калі-нікалі вызначаюцца яшчэ дзве дадтковыя прычыны спыненння шлюбу: цяжкая хвароба і адсутнасць без вестак аднаго з бакоў. Але як праваслаўныя, так і каталікі, не заўсёды карысталіся паслугамі царквы для надання шлюбу фармальнай законнасці, што адлюстроўваюць акты судоў і нормы статутаў.

Скасоўваўся шлюб духоўным судом [статуты 1566, 1588 гг.]. Свецкі суд меў толькі маёмаснае дачыненне. Пры скасаванні шлюбу афармляўся так званы "разводны ліст" (мяшчане і шляхта). Сярод сялянства шлюб часцей не афармляўся пісаным правам. І пры скасаванні шлюбу мужчыны мелі прывілеяванае становішча, што яскрава бачна з маёмасных вынікаў [р. 5 арт. 2 статута 1588 г.].

Лёс дзяцей пасля спынення шлюбу вырашаўся па ўзаемнай згодзе сужэнцаў па свецкаму праву і яны перадаваліся невінаватаму боку паводле кананічнага права.

Апрача скасавання шлюбу, існавала праблема яго ўзнаўлення. Праваслаўная царква дазваляла ўзнаўленне шлюбу, калі яго скасаванне не мела вынікам царкоўнае пакаранне. Але не дапускалася ўзнаўленне шлюбу пры скасаванні яго з прычыны пастрыжэння мужа або жонкі.

*А.А. Любіч*

БДЭУ (Мінск)

## ПРА НЕКАТОРЫЯ ШЛЯХІ НЕДАПУШЧЭННЯ МАНАПАЛІСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НА ТАВАРНЫХ РЫНКАХ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Мэта нашай сённяшняй працы — дэманстрацыя магчымых шляхоў стварэння спрыяльнага для грамадства канкурэнтнага асяродка на таварных рынках краіны на аснове станоўчага замежнага вопыту.

Трэба памятаць, што на новым этапе развіцця сусветных гаспадарскіх стасункаў кіруючую ролю адыгрывае канкурэнцыя не кошту, а якасці, менавіта яе патрэбна стымуляваць у першую чаргу.

Усе выпадкі ўзнікнення манапалізма на таварных рынках можна падзяліць на дзве катэгорыі: манаполіі ў вытворчым і ў трэтычным сектарах.

Пачнем з выпадкаў манапалізацыі ў трэтычным сектары эканомікі. Гэты сектар характарызуецца існаваннем на ім мадэлі, што набліжана да закончанай канкурэнцыі. Практычна немагчыма дасягненне прыватнай асобай манапольнага палажэння на такім рынку, бо парог неабходных фінансавых затрат для ўваходжання на яго нязначны, а кладзеныя грошы хутка вяртаюцца з прыбыткам. Адзіны суб'ект гаспадарання, які можа тут стаць манапалістам, выкарыстоўваючы свой асобы статус — гэта дзяржава. Такім чынам, вырашэннем пытання пра недапушчальнасць манапалізацыі з'яўляецца тут раздзяржаўленне. Як паказвае сусветны вопыт, нават камунальны транспарт можа быць аб'ектам раздзяржаўлення. Праблема гэта даволі актуальная, асабліва для Мінска. Праблемы, звязаныя з працай камунальнага транспарта, можна было б вырашыць, стварыўшы канкурэнцыю ў двух напрамках: за кошт актыўнага ўкаранення маршрутных таксі і дзякуючы канцэсаванню (праз дамову франчайзінга) стратных маршрутаў аўтобусаў.

Рынак сыравіны з'яўляецца больш складаным ў гэтых адносінах. Тут да месца было б больш шырокае выкарыстанне інстытута канцэсіі, на што указаў пад час апошняга Паслання да беларускага народа і Нацыянальнага сходу Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.

БДЭУ Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ Белорусский государственный экономический университет. Библи
BSEU Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by